Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/12. sprava H 15

# Навіны №3

РАДАЎ

БНФ "Адраджэньне"

*ліпень* 1999 году — інфармацыйны бюлетэнь

**У НУМАРЫ**

*Лявон Баршчэўскі* -- ЯК МЫ КІРАВАЛІ ФРОНТАМ ▪

*Вінцук Вячорка* -- СЛУХАЙМА СЯБЕ! ▪

*(Трэнінг-сэмінар для актывістых з Фронту)*

*Юры Хадыка* -- ТАКТЫКА ФРОНТУ ▪

*(Вытрымкі з даклада на V Зьезьдзе)*

ЗВАРОТ ДА ЗЬЕЗДУ *зь Берасьцейскае філіі* ▪

**АД РЭДАКЦЫІ: Шаноўны чытача!**

**Дзіўным і незразумелым можа падацца на першы пагляд выпадак, які здарыўся з накладам другога нумару бюлетэню!**

**Сакратаром Управы сп. Ул. Юхо было вывезена ў лес і спаляна палова накладу!**

**Як казаў Рэмарк вуснамі аднаго з герояў свайго твору: "А на Заходнім фронце ўсё спакойна!".**

**А ў гэты час фашыстыя палілі кнігі на пляцах Бэрліну...!!!**



*Лявон* ***БАРШЧЭЎСКІ,***

***В.а. Старшыні БНФ "Адраджэньне"***

**Надышоў час распавесьці пра тое, якія праблемы існавалі ў кіраўніцтве Беларускім Народным Фронтам у 1997--99 гадах**, калі ўвесь міжзьездаўскі перыяд старшыня арганізацыі знаходзіўся за межамі Беларусі. Гэты аповед дасьць магчымасьць разабрацца, чаму зладжаная сыстэма кіраўніцтва, якая шмат у чым забясьпечыла эфэктыўную "Вясну-96" і неправальную "Вясну-97", у два апошнія гады перастала функцыянаваць, а менавіта гэта адбылося пасьля пятага зьезду Фронту.

## ЯК МЫ КІРАВАЛІ ФРОНТАМ

Бурлівыя падзеі тых гадоў плянаваліся калектыўным кіраўніцтвам арганізацыі, і перакананым прыхільнікам такога кіраўніцтва я быў. Менавіта такое кіраваньне, зрэшты, прадугледжвае наш Статут. Калі ў траўні 1996 г. Зянон Пазьняк прапанаваў зацьвердзіць мяне выканаўцам абавязкаў Старшыні БНФ "Адраджэньне", я пагадзіўся на гэта зь цяжкасьцю, і якраз пры ўмове, што ўсе істотныя палітычныя рашэньні ў Фронце будуць прымацца шляхам калектыўнага абмеркаваньня, *праз кансэнсус намесьнікаў старшыні й сакратароў Управы*. Да пятага зьезду гэтая схема працавала больш-менш бяз збояў, прычым калектыўны характар прыманых рашэньняў спалучаўся з калектыўнай адказнасьцю і ўзаемападстрахоўкай кіраўнікоў Фронту.

Вядома, ня варта ідэалізаваць гэтую схему, але ў сытуацыі, якая склалася на той момант, калі старшыня апынуўся далёка ад гарачых штодзённых справаў арганізацыі, яна, паўтаруся, спрацоўвала. Вялікія праблемы пачаліся менавіта пасьля мінулага зьезду. Перадгісторыя была наступная. Спадару Зянону Пазьняку і некаторым іншым нашым калегам усё болей не падабаліся асобныя палітычныя дзеяньні намесьніка Старшыні прафэсара Юрыя Хадыкі, ягоная прыродная схільнасьць да кампрамісаў. Не заўсёды яна была даспадобы і мне, але мне ў галаву не прыходзіла паставіць пад сумнеў права сп. Хадыкі ўваходзіць у найвышэйшае кіраўніцтва Фронту - права як маральнае (узгадайма гераічную галадоўку 1996 году), так і палітычнае (у найвышэйшым кіраўніцтве Фронту ён знаходзіўся ад першага зьезду БНФ). Пагаджаўся з гэтым напачатку і Зянон Пазьняк. Але за тры дні да пачатку мінулага зьезду, як вы ведаеце, я трапіў у турму, і калі мяне на зьезд адпусьцілі - напярэдадні, у 10 гадзін увечары, я атрымаў ад Старшыні Фронту прапанову спадара Хадыку намесьнікам болей не выбіраць, а замест яго выбраць намесьнікам Старшыні Фронту сп. Сяргея Папкова. Разумеючы палітычную несувымернасьць гэтых дзьвюх фігураў, я, аднак, не ўстаяў перад націскам сп. Пазьняка і здолеў адно дамагчыся, як мне тады здавалася, кампрамісу - каб сп. Пазьняк прапанаваў на зьезьдзе ў свае намесьнікі іх абодвух.

*(працяг на 2-й старонцы)*



vytoki.net

*(працяг, пачатак на 1-й старонцы)*

Як цяпер я бачу, менавіта прыход у кіраўніцтва сп. Папкова і парушыў там ранейшы баланс сілаў і, па сутнасьці, разбурыў магчымасьць прымаць кансэнсусныя рашэньні.

Чаму ж я пагадзіўся на кандыдатуру сп. Папкова? Вы памятаеце, як у дакладзе на пятым зьездзе я наракаў на слабое фінансавае забесьпячэньне дзейнасьці Фронту як магутны тормаз у нашай рэальнай працы. Ведаючы (хоць і даволі цьмяна) пра пэўны досьвед сп. Папкова ў прадпрымальніцкай дзейнасьці, я спадзяваўся, што ён актыўна зоймецца менавіта гэтым вельмі важным аспэктам арганізацыі нашага функцыянаваньня. Дзеля гэтага ўсё кіраўніцтва было гатовае даць яму ўсе неабходныя паўнамоцтвы, і гэта было зроблена. Нагадваю, што жнівеньскі сойм 1997 года афіцыйна ўсклаў *адказнасьць за фінансавае забесьпячэньне Ўправы* на сп. Папкова, а на лістападаўскім сойме таго ж году сп. Папкоў атрымаў дадатковыя (адмыслова нават не прадугледжаныя статутам Фронту) паўнамоцтвы каардынатара Ўправы. Сёньня я бачу ў гэтым (*а ініцыятыва зноў-такі тут была мая*) чарговую сваю памылку, бо нават пытаньне пра здабываньне грошай на арэнду нашай цэнтральнай сядзібы вырашалася самым недарэчным чынам. Мы мусілі тады плаціць больш як 1100 даляраў штомесяц, бо сп. Папкову спатрэбілся больш за год, каб вырашыць пытаньне пра афіцыйнае размяшчэньне ў нашым офісе яшчэ некалькіх арганізацыяў. І тут проста гераічныя высілкі рабілі іншыя кіраўнікі Фронту, і напрыклад сп. Вінцук Вячорка, каб знайсьці гэтыя фантастычныя для нас сродкі. У выніку мы фактычна не маглі аказваць дапамогі ахвярам рэпрэсіяў, падтрымліваць неяк нашыя мясцовыя арганізацыі, дый на акцыі грошай у такой сытуацыі не магло хапаць. Варта тут прывесьці й самы сьвежы прыклад. 9 ліпеня сёлета Аргкамітэтам шостага зьезду БНФ "Адраджэньне" сп. Папкову было прапанавана стаць адказным за фінансавае забесьпячэньне гэтага зьезду. На наступны тыдзень, 16 ліпеня, ён адмовіўся зрабіць і гэта. І зноў аўральным мэтадам гэтае пытаньне давялося вырашаць старшыні Аргкамітэту сп. Вячорку.

Паколькі і ў мяне з пошукам неабходных для Фронту сродкаў часта бывалі вялікія цяжкасьці, я абсалютна мог бы зразумець і гэтыя цяжкасьці сп. Папкова, калі б не адно "але". У той самы час ён, сп. Папкоў, нейкім чынам знаходзіў вялізныя сумы, напрыклад, на паездкі на фронтаўскім аўтамабілі (з кіроўцам сп. Юхо) у Польшчу і нават ў Францыю, значныя сумы на друкаваньне вялікай колькасьцю на рызографе кожнага выступу (факса) сп. Пазьняка ды рассыланьне гэтых і іншых матэрыялаў па нашых структурах. Удакладню: толькі тых матэрыялаў, якія адлюстроўвалі *пазыцыю самога сп. Папкова* па тых ці іншых пытаньнях. Да прыкладу, калі



*(Чарнобыльскі Шлях-96)* Фота Irex-ProMedia

старшыня Гомельскай гарадзкой рады Фронту сп. Старчанка напісаў артыкул пра сёлетнюю прэзыдэнцкую кампанію, у якім выказваліся такія ж ацэнкі гэтай кампаніі, як у сп. Папкова, то і яго артыкул быў імгненна памножаны й разасланы па структурах Фронту. Гэтак рабілася два гады. І ў гэтым у прынцыпе нічога кепскага няма, бо сябры Фронту павінны атрымліваць як мага болей інфармацыі пра пазыцыю, ацэнкі як кіраўнікоў, так і шараговых фронтаўцаў. Але ж тут сытуацыя склалася зусім іншая. Ніводзін са шматлікіх артыкулаў ці выступаў на Сойме, напрыклад, выканаўцы абавязкаў старшыні Фронту Баршчэўскага альбо намесьнікаў старшыні Фронту спадароў Хадыкі, Вячоркі, Гусака такога гонару з боку сп. Папкова і Ўправы не ўдастойваўся.

Вядома, сп. Папкоў можа сказаць, што гэта ён *за свае грошы* ўзяўся распаўсюджваць тое, што яму болей даспадобы. Толькі тут узьнікае пытаньне: ці ў палітычнай арганізацыі права на шырокае распаўсюджваньне інфармацыі павінен мець толькі той, у каго на гэта ёсьць грошы? Другое пытаньне: ці былі гэтыя грошы сп. Папкова выключна ягонымі ўласнымі грашыма? Ці не зарабляліся яны з выкарыстаньнем імя і маёмасьці (напрыклад, таго ж аўтамабіля) Фронту? Пытаньняў тут, вядома, болей, чым адказаў. Вось так перад самым шостым зьездам у частцы сяброў Фронту ўзьнікла ідэя выданьня "Навінаў радаў БНФ "Адраджэньне"", супольна былі знойдзеныя сродкі на гэта - прычым кола аўтараў там не абмяжоўвалася.

Але вярнуся непасрэдна да праблемы кіраваньня Фронтам. Пасьля пятага зьезду фармавалася Ўправа БНФ - наш галоўны *выканаўчы* орган, які нясе на сабе ўвесь цяжар штодзённай працы тут, у Беларусі. Вы ведаеце, што Сойм, галоўны *палітычны* орган, быў выбраны на зьездзе з самым поўным улікам думкі Старшыні Фронту - што натуральна. І я таксама -- што зусім лягічна -- паставіў перад сп. Пазьняком (5-6 жніўня 1997 г. у часе сустрэчы зь ім у Кіеве) пытаньне аб складзе Ўправы, бо адказнасьць за арганізацыю выкананьня рашэньняў зьезду й Сойму ў Беларусі так ці йначай найперш клалася пэрсанальна на мяне. Аднак мае прапановы наконт падзелу працы ва Ўправе і асобных пэрсаналіяў былі фактычна Старшынём праігнараваныя, таму ў той жа дзень, 6 жніўня, я напісаў на яго імя заяву з просьбай вызваліць мяне ад выкананьня абавязкаў старшыні.

*(заканчэньне на 9-й старонцы)*



vytoki.net



**Вінцук ВЯЧОРКА**
*Намесьнік Старшыні БНФ “Адраджэньне“*

# СЛУХАЙМА СЯБЕ!

У праграме сэмінару-практыкуму адбыліся інтэрактыўныя (гэта значыць дыялягічныя) паседжаньні на тэмы ***"Як папулярызаваць нацыянальна-незалежніцкую ідэю", "Як палепшыць імідж нашай арганізацыі", "Як здабыць рэсурсы для працы арганізацыі", "Як правільна наладзіць працу арганізацыі".*** Уся гаворка стала "мазгавым штурмам" дзеля адказу на галоўнае пытаньне: ***"Як аднавіць папулярнасьць Фронту і забясьпечыць яго прыход да ўлады".***

Мінулае суботы тры камісіі БНФ -- прапаганды й контрапрапаганды, Праваабарончая і па сувязях з рабочым рухам, а таксама грамадзкія арганізацыі "Вясна-96", "Беларуская пэрспэктыва", Цэнтар Супольнасьць і газэта "Рабочы" наладзілі ў сядзібе БНФ на вул.Варвашэні, 8 сэмінар-практыкум для актывістаў Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне" на тэму **"Як зрабіць вынікавай працу нашай арганізацыі"**. На сэмінар прыехаў 41 чалавек з усіх рэгіёнаў Беларусі, пераважна -- дэлегаты будучага VI зьезду БНФ. Практыкум праводзілі Алесь Стральцоў, Віктар Івашкевіч, Уладзімір Падгол і аўтар гэтага артыкулу.

Але перадусім удзельнікам было прапанавана зрабіць добра вядомы спэцыялістам у галіне мэнэджмэнту SWOT-аналіз цяперашняга становішча й магчымасьцяў нашай арганізацыі *(гл. табліцу)*. Фактары нашае нутраное моцы, нутраное

*(працяг на 4-й старонцы)*

**Вынікі калектыўнага SWOT-аналізу БНФ**

*(Трэнінг-сэмінар для мясцовых актывістаў БНФ. 24 ліпеня 1999)*

| | | |
|---|---|---|
| Нутраныя фактары | **Strengths (Моцныя бакі)**<br>*А. Псыхалягічныя, іміджавыя*<br>Нацыянальная ідэя як матыў дзейнасьці<br>Мэтанакіраванасьць<br>Успрыняцьце Фронту як праўдзівай сілы<br>Дзесяцігадовы досьвед працы<br>Вядомасьць і пазнавальнасьць<br>Аўтарытэт (нават ворагі паважаюць, бо баяцца)<br>*Б. Арганізацыйныя*<br>Арганізаванасьць<br>Наяўнасьць агульнанацыянальнай структуры<br>Высокі адукацыйны цэнз сяброў БНФ<br>Параўнальная масавасьць<br>Наяўнасьць як руху, так і партыі БНФ<br>Моцны лідэр | **Weaknesses (Слабасьці)**<br>*А. Псыхалягічныя, іміджавыя*<br>Несфармуляванасьць нацыянальнае ідэі<br>Недахоп станоўчага іміджу ў Фронта<br>Стомленасьць ад безвыніковае працы<br>Праблемы міжлюдзкіх стасункаў у Фронце<br>*Б. Арганізацыйныя*<br>Недахоп матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў<br>Недастатковасьць прафэсіяналізму<br>Неадэкватнасьць радыкальных словаў і справаў<br>Адсутнасьць сваёй прэсы<br>Праблемы ў кіраўніцтве Фронту<br>Недасканалае кіраваньне і сыстэма прыняцьця рашэньняў<br>Адсутнасьць сыстэмы працы з кадрамі<br>Неаптымальнасьць ўзроставае структуры<br>Распыленасьць на працу ў няўрадавых арганізацыях<br>Наяўнасьць як руху, так і партыі БНФ<br>Лідэр за мяжой |
| Вонкавыя фактары | **Opportunities (Нявыкарыстаныя рэсурсы)**<br>*А. Электаральныя й палітычныя*<br>Шмат людзей незалежніцкіх паглядаў па-за Фронтам<br>Пратэсты рабочых і прадпрымальнікаў<br>Уздым грамадзкіх арганізацыяў<br>Грамадзкія і палітычныя арганізацыі зь незалежніцкімі паглядамі<br>Беларускія незалежныя СМІ<br>Памылкі Лукашэнкі<br>*Арганізацыйныя*<br>Адукацыйныя й рэсурсавыя магчымасьці няўрадавых арганізацыяў<br>Замежныя прадстаўніцтвы БНФ<br>*Замежнапалітычныя*<br>Слабасьць расейскай імпэрыі<br>Згода Захаду дапамагаць беларускай дэмакратыі | **Threats (Пагрозы)**<br>*А. Электаральныя й палітычныя*<br>Перавага ў электараце Homo sovieticus<br>Русіфікаванасьць<br>Праваакцыйнасьць спэцслужбаў<br>Дэзінфармацыя ў беларускіх афіцыйных СМІ<br>Беларускія незалежныя СМІ<br>Прарэжымнасьць пазыцыі РПЦ<br>Эканамічны інтарэс намэнклятурных клянаў<br>Разбуранасьць праўнага поля<br>*Б. Замежнапалітычныя*<br>Расейская імпэрская палітыка<br>Расейскія СМІ<br>Расейская мас-культура<br>Геастратэгічнае становішча Беларусі<br>Замежны капітал, зьвязаны з Расеяй |



vytoki.net

*(працяг, пачатак на 3-й старонцы)*

слабасьці, вонкавых нескарыстаных магчымасьцяў і, урэшце, вонкавых пагрозаў. Мне давялося толькі згрупаваць іх тэматычна ў межах кожнае чвэрткі табліцы.

Нагадаю: кожны называў пазыцыі, якія лічыў патрэбным, і сьпіс можна дапаўняць. Але цешыць, што найдаўжэйшым апынуўся сьпіс нявыкарыстаных магчымасьцяў, і сьмела можам укладаць іх у праграму асваеньня. Бо Фронт у стане кантраляваць узрост і сацыяльнае, і грамадзкае актыўнасьці. І зусім недапушчальна, калі ў нашым грамадзтве тых, хто падзяляе незалежніцкія каштоўнасьці, у 7-9 разоў болей, чым тых, хто давярае Фронту.

Лёгка заўважыць: некаторыя пазыцыі паўтараюцца як у левай (моцныя бакі), гэтак і ў правай (слабасьці) частках табліцы. Гэта, прыкладам, **незалежныя СМІ**. Адкуль такая дыямэтральна процілеглая трактоўка? Бо відавочна, што незалежныя сродкі інфармацыі -- адзін з найбольш істотных і рэальных здабыткаў пасьлякамуністычнае гісторыі Беларусі. Калі ж нехта ўспрымае незалежныя газэты як пагрозу Фронту -- значыць, ён мысьліць таталітарнымі стэрэатыпамі: замест таго каб прафэсійна працаваць з рэдакцыямі й журналістамі, прафэсійна вучыць сваіх прэс-аташэ й журналістаў, урэшце, выдаваць свае газэты (як усё гэта робяць палітычныя партыі ва ўсім сьвеце) -- прасьцей клеіць ярлыкі на незалежную прэсу, якой і без таго дастаецца ад рэжыму ня менш за нас.

Некалькі арганізацыйных і псыхалягічна-іміджавых перавагаў (разьдзел табліцы "Моцныя бакі") нэўтралізуюцца адным радочкам у разьдзеле "Слабасьці": **Недахоп станоўчага іміджу ў Фронту**. Можна быць добра структураванымі й дасягнуць ідэальнае дысцыпліны выкананьня загадаў, але калі не падпарадкаваць працу палітычнага руху заваяваньню папулярнасьці ў людзей -- уся арганізацыйная праца застанецца вавёрчыным бегам у коле.

Менавіта з рознага разуменьня задачы, якая стаіць перад Фронтам як палітычнаю сілаю, і вынікла нечаканае "раздваеньне" на пазытыў і нэгатыў фактару двухаблічнасьці БНФ (мы -- і партыя, і рух). Сапраўды, калі дбаць пра пашырэньне й перамогу ў грамадзтве нацыянальнай ідэі, -- не абысьціся без магчымасьцяў, якія дае рухаўская праца. Калі ж замкнуцца на выкананьні адарваных ад жыцьця загадаў -- тады рух не патрэбны.

Радок з разьдзелу "Моцныя бакі": "Моцны лідэр". Моцны -- у сэнсе харызматычны, валявы. На жаль, доўгі пералік арганізацыйных праблемаў Фронту ў разьдзеле "Слабасьці" даказвае, што наяўнасьць лідэра такога тыпу за мяжой прывяла БНФ да арганізацыйнага крызысу.

Усе **вонкавыя пагрозы** -- дадзенасьць. Мы доўга будзем змушаныя працаваць у варунках гэтых пагрозаў. І адказаць на іх можна толькі прафэсійнаю працаю на трывалай матэрыяльна-тэхнічнай і рэсурсавай аснове. Сёньня такія магчымасьці -- адукацыйныя, інфармацыйныя, аналітычныя, матэрыяльна-тэхнічныя -- даюць мажлівасьць супрацоўніцтва з грамадзкімі арганізацыямі, з "трэцім сэктарам". Гэтае супрацоўніцтва -- зусім не распыленьне нашых сілаў, як спрабуюць пераканаць некаторыя артадоксы, а, наадварот, канцэнтрацыя сілаў актыўнае часткі грамадзтва вакол БНФ.

Наагул, SWOT-аналіз служыць некалькім мэтам. Ён прымушае прызнавацца ня толькі ў тым, што навакольны сьвет табе перашкаджае, але і ў тваіх уласных слабасьцях. А толькі прызнаўшы слабасьці, можна ставіць перад сабой задачу іх пераадолець. Як мне здаецца, у левым ніжнім квадраце табліцы ("Нявыкарыстаныя рэсурсы") дастаткова пазыцыяў, каб пераадолець нашыя слабасьці.

Я сумысьля не ўключыў у табліцу яшчэ адзін нявыкарыстаны рэсурс: магчымасьці, якія дае прыход да ўлады або прынамсі ў рэальны (г.зн. надзелены ўладаю) парлямэнт. Калі гісторыя, у тым ліку й дзякуючы нашай дзейнасьці, кіне нам гэты выклік, ці гатовыя мы да яго? Ці дастаткова мы папулярныя і прафэсійна падрыхтаваныя, каб перамагчы ў свабодных і справядлівых выбарах?

* * *

У межах свае тэмы ("Імідж БНФ і шляхі яго паляпшэньня") намесьнік старшыні Камісіі прапаганды й контрапрапаганды БНФ, кандыдат філязофскіх навук Уладзімір Падгол праанкетаваў прысутных фронтаўскіх актывістаў. Колькасныя вынікі анкетаваньня пададзеныя ў дужках перад кожным варыянтам адказу.

1. Як Вы лічыце, калі б 16 траўня ўсе сябры БНФ правялі выбары прэзыдэнта, выйшаўшы з урнамі для галасаваньня на вуліцы, арганізаваўшы стацыянарныя ўчасткі ў палатках, у штаб-кватэрах, то што б тады атрымалася:

а (*2* адказы). БНФ "Адраджэньне" пацярпеў бы палітычную паразу.

б (*1*). БНФ "Адраджэньне" быў бы разгромлены і сышоў бы з палітычнай арэны.

**в (*29*). БНФ "Адраджэньне" зьдзейсьніў бы дэманстрацыю нацыянальнай ідэі і дэмакратыі і атрымаў бы палітычную перамогу, паказаўшы і насельніцтву і дыпляматам, што толькі БНФ -- адзіная магутная палітычная сіла на Беларусі.**

**2.** Што найбольш важна для абароны незалежнасьці:

а (*3*). Выяўляць ворагаў-агентаў Масквы, якія маскуюцца, хочуць разбурыць апазыцыю, падмяніўшы яе "прамаскоўскай апазыцыяй", і канцэнтраваць усе сілы на барацьбу з імі

ці

**б (*26*). Канцэнтраваць усе сілы на барацьбу з дыктатарскім рэжымам, а замаскаваных ворагаў выкарыстоўваць на карысьць барацьбы за незалежнасьць.**

**3.** Што больш эфэктыўна ў барацьбе за незалежнасьць Беларусі:

**а (*27*). Падтрымліваць пазытыўныя крокі Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня, які прызнаны ЗША, АБСЭ, Міжпарлямэнцкай асамблеяй, НАТО як легітымны гарант незалежнасьці Беларусі,**

ці

б (*2*). Утвараць новы заканадаўча-прадстаўнічы грамадзянскі Парлямэнт і надалей дамагацца ягонай легітымнасьці ў сьвеце.

*Увага: у дзьвюх анкетах падкрэсьленыя абодва адказы.*

**4.** Вы бачыце БНФ "Адраджэньне":

а (*2*). войскам, якое мусіць падпарадкоўвацца загадам старшыні БНФ, як камандзіра,

ці

**б (*29*). дэмакратычнай арганізацыяй, якая дзейнічае на падставе Статута, паводле якога вы**

*(заканчэньне на 9-й старонцы)*



vytoki.net



*Юры ХАДЫКА*
*Намесьнік*
*Старшыні*
*БНФ "Адраджэньне"*

**На мінулым зьезьдзе разглядалася спрэчка, якая была выклікана нашым правалам на рэфэрэндуме і выбарах у траўні 1995 году.** Нажаль, яна набыла выгляд сутыкненьня асобаў, а не дыскусіі па праблеме тактыкі БНФ, бо яе сапраўднаю асноваю былі розныя ўяўленьні пра сродкі і мэтады дасягненьня канцавое мэты нашага руху - стварэньня сапраўды незалежнае, дэмакратычнае Беларусі і адраджэньне беларускае нацыянальнае культуры.

## ТАКТЫКА ФРОНТУ

*(Вытрымкі з даклада Ю. Хадыкі на V Зьезьдзе БНФ "Адраджэньне")*

Паважаныя сябры!

Першы тактычны стыль дзейнасьці Фронту, які стаў пануючым з часу пасьпяховых для нас выбараў 1990 году, можна ўмоўна назваць "палітычным". Мы сканцэтравалі ўсе нашыя намаганьні па падтрымцы і забясьпячэньню дзейнасьці фракцыі ў Вярхоўным Савеце. Нават масавыя мерапрыемствы праводзілі пад эгідаю дэпутатаў. Супроцьстаялі ў большай ці меньшай меры прыцягненьню да агульнае працы нанова народжаных партыяў дэмакратычнага накірунку. Апраўданьнем такое тактыкі было простае меркаваньне - найбольш просты шлях да дасягненьня стратэгічных мэтаў ляжыць праз заваёву палітычнае ўлады. Для гэтага і была створана партыя БНФ, калі стала відавочным, што на чарговых выбарах грамадзкія рухі будуць пазбаўлены права вылучэньня кандыдатаў у дэпутаты.

Першыя прыкметы крызісу гэтай тыктыкі выявіліся яшчэ ў 1994 годзе пад час прэзыдэнскае кампаніі, калі не ўдалося а ні ўзгадніць адное кандыдатуры, а ні перашкодзіць сацыял-дэмакратам вылучыць свайго кандыдата. Нягледзячы на аб'ектыўна важкія шанцы на перамогу дэмакратычных сілаў, мы, гуляючы "па максымуму", страцілі амаль усё. І травеньскі рэфэрэндум праз год пацьвердзіў гэта, таму што мы не зьмянілі тактыку. Мы вылучылі больш за 200 кандыдатаў, не ўзгадніўшы зь іншымі партыямі ніводнае акругі. І ў нас папросту не хапіла сілаў супроцьдзеяньня рэфэрэндуму.

Памылка была аднак не ў самім факце ўдзелу ў выбарах, а ў нашай саманадзейнасьці, у нежаданьні выконваць ролю агульнанароднага руху. Тое ролі, якую акрамя БНФ і сёньня ніхто не ў стане адыгрываць. Мы непрадухілілі непажаданае канкурэнцыі і ў выніку толькі лічаныя кандыдаты з дэмакратаў прайшлі ў новы склад Вярхоўнага Савету XIII скліканьня. Мы добра бачылі сапраўдную палітычную прыроду Аляксандра Лукашэнкі - гэтага "маладога ваўка" старое камуністычнае намэклатуры і стаўленьніка імпэрскіх сілаў Расеі.



*(Міліцыя і жанчына)* Фота Irex-ProMedia

Аднак палітычны рыгарызм, перабольшваньне нашых ідэлягічных разыходжаньняў зь блізкімі нам партыямі перад тварам рэальнае небясьпекі, а, часам, і адкрытыя абразы іхных лідараў, зашкодзілі нам выканаць нашую натуральную місію аб'яднаньня ўсіх антылукашэнкаўскіх, антыімпэрскіх сілаў.

Я не здарма стаўлю гэтыя вызначэньні праз коску, побач. Разумеючы пры гэтым, што не ўсе антылукашэнкаўскія сілы зьяўляюцца адкрыта антыімпэрскімі. Аднак, хаця палітыка - не алгебра, некаторыя правілы агульныя. Вораг майго ворага, мне сябра. А не наадварот. У нашай паразе вясною 1995 году мы павінны былі ў першую чаргу вінаваціць саміх сябе, а не Лукашэнку, лукашэнкаўскую прапаганду ці іншыя партыі. Партыяў шмат, а Беларускі Народны Фронт - адзін.

Аднак менавіта спрэчкі вакол ацэнкі нашых тактычных памылак, якія набылі форму канфлікту асобаў, прывялі да адхіленьня ад франтаўскай працы шэраг сяброў, якімі Фронт не мае права ахвяраваць.

І гэта праблема ня толькі палітычная. Але і маральная. Мы заўсёды дэклеравалі маральную палітыку. Але не заўсёды яе праводзілі. І ў апошнія часы такія выпадкі сталіся рэгулярнымі. Я - адзін з старэйшых удзельнікаў БНФ і ня толькі па стажу ў арганізацыі. Таму мой абавязак сказаць пра гэта адкрыта.

*(працяг на 8-й старонцы)*



vytoki.net

***Анатоль ФЕДАРАЎ***
*сябра Сойму*
*БНФ "Адраджэньне"*

# ПРА СЫТУАЦЫЮ Ў ФРОНЦЕ

**1. Прычыны канфлікту:**

а) палітычныя паразы і страта ініцыятывы Фронтам на працягу апошніх гадоў; неадпаведнасьць палітычных рашэньняў і дзеяньняў аб'ектыўнай сытуацыі;

б) страта палітычнага адзінства й калегіяльнасьці пры прыняцьці рашэньняў; фармаваньне заганнага стылю кіраўніцтва;

в) неадпаведнасьць узрослага вопыту і вагі рэгіянальных і іншых арганізацыяў іх рэальнае ролі ў кіраўніцтве Фронту;

г) эміграцыйныя праблемы Пазьняка:
- праблема эфэктыўнага кіраўніцтва;
- праблема каманды;
- праблема адэкватнасьці рашэньняў;

д) супярэчнасьці ў праблеме кансалідацыі апазыцыі;

е) іншыя праблемы.

**2. Магчымыя варыянты развіцьця сытуацыі:**

а) кансэрвацыя існуючага становішча; умацаваньне гіерархічнае ("вэртыкальнае") структуры, ізаляваньне і выцясьненьне з арганізацыі актыўнае "апазыцыі", палітычнае ізаляваньне і самаізаляваньне Фронту;

б) частковыя (касмэтычныя) зьмены ў Фронце, якія не выпраўляюць, а толькі заблытваюць сытуацыю; далейшае паглыбленьне расколу і дыскрэдытацыя арганізацыі;

в) прынцыповыя зьмены ў палітычных падыходах, у стылі кіраўніцтва, у вызначэньні арганізацыйна-функцыянальных роляў і інш.

Зьяўляецца магчымасьць для падвышэньня палітычнага іміджу лідэра Фронту, стварэньня новых пэрэспэктываў для арганізацыі, гуртаваньня вакол яе незалежніцкіх сілаў і інш.



*Г. Сямдзянава, А. Лукашэнка, З. Пазьняк – дэпутаты В. С. 12-га скліканьня*

**3. Прапановы па нармалізацыі сытуацыі:**

а) аднаўленьне дэмакратычных нормаў у дзейнасьці арганізацыі і яе кіраўніцтве; ліквідаваньне "вэртыкалі";

б) вяртаньне да працы зладжанай партыйнай камандай, утварэньне Палітсамітэту, падвышэньне ролі Сойму, Ценявага Габінэту і інш;

в) новае вырашэньне праблемы кіраўніцтва, як праблемы эфэктыўнай палітыкі і мэнэджмэнту, а ні як праблемы асабістага лідэрства;

г) падвышэньне прадстаўніцтва ў кіруючых органах фронту рэгіянальных і іншых арганізацыяў, наладжваньне іх сумеснай працы і працы з "цэнтрам";

д) прыцягненьне ў арганізацыю сьвежых інтэлектуальных сілаў, былых актывістаў БНФ, грамадзкіх і палітычных дзеячоў, спэцыялістаў;

е) стварэньне блёка нацыянальна-патрыятычных і кансалідацыя вакол Фронта ўсіх дэмакратычных сілаў;

ж) распрацоўка эфэктыўных мадэляў і кірункаў палітычнае дзейнасьці, карэктыроўка палітычнага курсу.

## НЕКАТОРЫЯ ЗАЎВАГІ АДНОСНА ПАЛІТЫЧНАЕ СТРАТЭГІІ

1. Беларусь - наш агульны дом, які мы павінны будаваць для ўсіх (а ня толькі для сябе!)
2. Добра ўсё тое, што добра для незалежнасьці Беларусі!
3. Нашыя сябры - усе, хто за вольную, сувэрэнную Беларусь!
4. БНФ - шырокі нацыянальна-дэмакратычны рух. БНФ - з народа і для народа!
5. Расія - наш сусед і партнэр, зь якім нам будаваць добрыя дачыненьні. "Інтэграцыя" патрэбна палітычным банкрутам, а не народам Беларусі і Расіі.

**Правільная палітыка - эфэктыўная палітыка!**

## НЕКАТОРЫЯ ЗАЎВАГІ АДНОСНА ТАКТЫКІ ПАЛІТЫЧНАЕ ДЗЕЙНАСЬЦІ

1. Мітынгі, дэманстрацыі і іншыя масавыя акцыі сёньня - хутчэй анахранізм, чым эфэктыўная грамадзка - палітычная дзейнасьць. Праводзіцца павінны пры наяўнасьці дастатковых падставаў і добрай падрыхтоўцы.

2. Асноўныя палітычныя акцыі жорстка каардынуюцца і рэалізуюцца ў межах усёй Беларусі.

3. Усе акцыі, за асобнымі выключэньнямі, прывязваюцца да праблемаў людзей, а не да нашых праблемаў.

4. Любыя акцыі маюць сэнс толькі тады, калі яны інфармацыйна падрыхтаваныя, альбо ствараюць моцны інфармацыйны імпульс.

5. Дазвол на акцыю - найперш, дазвол на публічную інфармацыйную дзейнасьць.
Не самае важкае, колькі людзей прыме ўдзел у акцыі, самае важкае, колькі будзе пра яе ведаць (асабліва актуальна для раёнаў!).

6. Асноўны прынцып палітычнае дзейнасьці сёньня: не людзі да нас, а мы да людзей.

Магчымыя формы: сустрэчы зь цікавымі людзьмі (пісьменьнікі, гісторыкі, замежныя госьці, вядомыя выканаўцы, дзеячы культуры і г.д.), выкарыстаньне легальных каналаў для працы ў аўдыторыях (у навучальных установах, па лініі таварыства "Веды"; праз іншыя дзяржаўныя і грамадзкія арганізацыі), распаўсюджваньне агітацыйных матэрыялаў (на кірмашах, вуліцах, у транспарце, ля прадпрыемстваў ды інш.), збор подпісаў па сацыяльна - значных для →



vytoki.net

*(працяг, пачатак на 6-й старонцы)*

людзей пытаньнях і арганізацыя адмысловых акцыяў, культурніцкія і спартыўна - масавыя мерапрыемствы ды інш.

7. Асаблівая ўвага працы з электаральнымі групамі, якія маюць пэўныя праблемы: дробныя прадпрыймальнікі, беспрацоўныя, калектывы з канфліктнай сытуацыяй ды інш.

8. Найбольшая ўвага - працы з моладзьдзю. **За ёй будучыня!** Падтрымліваць моладзь, дапамагаць і давяраць ёй.

9. Выключна важкая праца - праца з грамадзкімі арганізацыямі, палітычнымі партыямі, прафсаюзамі, прадпрыймальніцкімі ды інш. структурамі. Праца ў грамадзкім сэктары - праца па выкарыстаньні вялізнага патэнцыялу гэтага сэктару.

10. Ўлічваючы абмежаванасьць сілаў і сродкаў, падтрымліваюцца, найперш, тыя ініцыятывы і кірункі дзейнасьці, якія засьведчылі сваю эфэктыўнасьць, а не ствараюцца новыя і штучныя.

11. Падтрымліваюцца любыя палітычна і сацыяльна - значныя ініцыятывы, нават калі яны зыходзяць і не ад нас.

**Удзел Фронту - справа Фронту!**

## ШТО РАБІЦЬ?

*(бліжэйшыя задачы партыйнага будаўніцтва)*

1. Далейшае пашырэньне структураў Фронту і іх нутраная структурызацыя.
2. Умацаваньне рэгіянальных арганізацыяў і каардынацыя іх працы з "цэнтрам".
3. Прынцыповыя зьмены ў структуры і стылі кіраўніцтва Фронтам.
4. Арганізацыя палітычнае адукацыі і абмену досьведам (асновы прапагандысцкай дзейнасьці і інш).
5. Падрыхтоўка спэцыялістаў для працы ў III сэктары.
6. Арганізацыя рэгіянальнага друку, сыстэмы распаўсюджваньня, ды інш.
7. Арганізацыя выданьня агульна фронтаўскай газэты.
8. Арганізацыя крыніцаў фінансаваньня, тэхнічнага ды іншага забясьпечаньня.
9. Праца ў III сэктары: падтрымка і арганізацыя NGO, фондаў ды інш.
10. Арганізацыя іншых структураў Фронту, для вырашэньня адмысловых праблемаў ( па агітацыі і прапагандзе, ды інш.). ■

# ДРУГОЕ ДЫХАНЬНЕ ФРОНТУ

**Зварот Цэнтральнае Рады Маладога Фронту да VI Зьезду БНФ "Адраджэньне"**

*(працяг, пачатак у 2-ім нумары)*

*Палітызаванасьць грамадзтва, так характэрная для канца 80-х - пачатку 90-х, зьмянілася значнай апатыяй, пагружэньнем насельніцтва ў свае ўнутраныя праблемы. На парозе новага тысячагодзьдзя на зьмену веку заклікаў і лёзунгаў надыходзіць эра рэальнае справы. У тых варунках, калі нармалёвая партыйная й выбарчая дзейнасьць немагчымыя, Фронт пакліканы пераносіць цяжар сваіх намаганьняў у глыбіню грамадзкага жыцьця, у самую гушчу народных чаканьняў і інтарэсаў. Менавіта Народны Фронт урэшце павінны адказаць на галоўнае беларускае пытаньне часу: "Калі не яны, дык хто?", адказаць і словам і справай: "Мы!".*

*На зацяглым этапе напружанага змаганьня за вольную Беларусь многія проста стаміліся й зьняверыліся. Фронту патрэбнае другое дыханьне. Прага абнаўленьня, чаканьне рэформаў у самім БНФ выклікана не крызысам лідэраў ці ўнутранымі ідэалягічнымі супярэчнасьцямі, а менавіта вострай патрэбаю зьмены вобраза дзеяньня.*



Удзельнікі акцыі "Чарнобыльскі Шлях-99"

**У першую чаргу**, БНФ трэба даць грамадзтву яснае й сыстэмнае ўяўленьне пра тое, што ён зьбіраецца рабіць пасьля падзеньня рэжыму, растлумачыць сваю праграмную пазыцыю й сутнасьць будучых пераўтварэньняў усім, ад чыноўніка да школьніка. Дзеля арганізацыі шырокамаштабовае агітацыі неабходныя сэрыі артыкулаў у незалежнай прэсе, правядзеньне ўлёткавых кампаніяў у перадвыбарчым стылі і мабілізацыя ўсіх магчымых сродкаў масавае інфармацыі, у тым ліку замежных.

**Па-другое**, Фронту зноў неабходныя моцныя рэгіянальныя й мясцовыя акцэнты, апошнім часам згубленыя. Нельга забывацца, што па ўсёй Беларусі БНФ пачынаўся з краязнаўчых гурткоў і суполак, што й пасёньня нашая сіла - у рэгіянальных структурах. Акцыі тутэйшага значэньня, націскі на тэмах горада й раёна, вобласьці й сельсавета, адкрыты выклік мясцовым уладам па ўсім спэктры праблемаў здольныя даць грамадзкую падтрымку тут і цяпер, закласьці капітальны фундамэнт выбараў любых узроўняў і будучых муніцыпальных рэформаў.

**Па-трэцяе**, дзеля рэалізацыі задачаў у сёньняшніх варунках БНФ неабходная разгалінаваная сыстэма філіяў і сатэлітарных арганізацыяў, якая

*(працяг на 12-й старонцы)*



vytoki.net

(заканчэньне, пачатак на 5-й старонцы)

Таму мой абавязак сказаць пра гэта адкрыта.

Магчыма Зянон Пазьняк мае рацыю, калі кажа, што сапраўдны палітык выбірае эміграцыю, а не турму. Так ва ўсялякім выпадку лічыў і "вялікі правадыр пралетарыяту" Уладзімер Ульянаў-Ленін. Бясспрэчным ёсьць ягонае права выбраць эміграцыю. Даваць з-за мяжы парады і крытыкаваць рашэньні кіраўніцтва і асобныя акцыі БНФ. У гэтым ёсьць нават не малая карысьць. З адлегласьці лягчэй бачны буйныя дэталі, затое незаўважныя дробязі, часам істотныя. Бо не ўсё ж можна паведаміць па тэлефоне, ці прачытаць у газэтах.

Праблема лідэрства ў Беларусі, на жаль, у апошнія часы набыла нейкія хворыя праявы. Усе шукаюць аднаго лідэра, быццам бы не жылі тады, калі мелі яго. Гэта нейкае ачмурэньне ад палітычнага посьпеху А. Лукашэнкі. Лідэраў павінна быць шмат. А рабіць з кагосьці аднаго лідэра і пазьней пераўтвараць яго ў куміра - гэта ня толькі палітычная памылка, а папросту грэх -- злачынства перад Богам і людзьмі. Людзі, якія ствараюць зь лідэра куміра, адначасна дэскрыдытуюць і арганізацыю, якую ён узначальвае.

Усе гэтыя хібы нашага жыцьця як раз і зьяўляюцца характэрнымі для тактыкі "палітычнага стылю", калі непасрэднаю мэтаю зьяўляецца ўлада. Калі іншыя партыі - канкурэнты, а не саратнікі. Калі трэба клапаціцца пра тое, каб хтосьці "не ўехаў да ўлады на гарбу БНФ". Але я глыбока перакананы, што пры нашым палітычным радыкалізьме сам Фронт здолее "уехаць да ўлады" і ўтрымаць яе не раней чым заваюе сталую палітычную падтрымку большасьці насельніцтва. Але тады пра нашыя хібы гаварыць будзе позна.

Пакуль жа нашая папулярнасьць вагаецца паміж 15 і 20%, нам папросту неабходна выкарыстоўваць тактыку "рухаўскага стылю". Імкнуцца аб'яднаць вакол сябе як мага болей саюзьнікаў і скіраваць агульныя намаганьні на дасягненьне не максымальных, а аптымальных мэтаў. А гэта вымагае тактоўных і цывілізаваных зносінаў, узгадненьня пазыцыяў, узаемных саступак, правядзеньня агульных акцыяў. І, натуральна, узаемнае павагі! Усё гэта складана, але магчыма - - на прынцыпах негвалтоўнага змаганьня за незалежную і дэмакратычную Беларусь, шляхам несупрацоўніцтва з дыктатарскім рэжымам і грамадзянскага непадпарадкаваньня антызаконнай, антанацыянальнай уладзе. Усё гэта адпавядае праграме і статуту Беларускага Народнага Фронту і не зьяўляецца аніякім адкрыцьцём. Гэта шлях, які Махатма Гандзі назваў "Сат'яграха" - упартасьць у ісьціне.

Індыя перамагла на гэтым шляху ў такіх жа неспрыяльных умовах, дзе былі і адсутнасьць агульнае мовы і разналікасьць веравызнаньняў.

Мы вярнуліся да тактыкі вулічнае дэмакратыі, прыцягваючы да сумеснага ўдзелу ў многіх акцыях парлямэнцкія партыі. І рабілі гэта на падставе калектыных рашэньняў. Ня гледзячы на натуральнае разыходжаньне ў поглядах.

Бясспрэчна, што тактыка сумесных масавых акцыяў прынесла карысьць нашым саюзьнікам. Дастаткова звярнуць увагу на тое, як пабольшала на мітынгах сьцягоў з чырвоным канём. А сацыялістыя ды прафсаюзы натхніліся на правядзеньне асобных мітынгаў і шэсьцяў. Але ж ня думаю, што гэта шкодзіць Фронту ці агульнай справе барацьбы з дыктатураю. Больш таго вулічная падтрымка радыкалізавала пазыцыі дэпутатаў АГП, БСДГ і, нават, большае часткі Прэзыдыюма Вярхоўнага Савету XII скліканьня па пытаньню нацыянальга сувэрэнітэту. Прамовы старшыні Прызыдыюму Вярхоўнага Савету сп. Сямёна Шарэцкага задаволяць сёньня любога нацыяналістага.

Летась у выніку ўзмацненьня сувязяў паміж апазыцыйнымі да рэжыму сіламі ў жніўні БНФ стаўся адзінаю пазапарлямэнцкаю партыяй заснавальніцай Круглага стала і ён прыняў заклік да Вярхоўнага Савету з патрабаваньнем імпічманту прэзыдэнта. Фронт зьяўляецца адзінаю пазапарлямэнцкаю партыяй, зь якою кансультуюцца місіі міжнародных арганізацыяў, і адзінаю, якая бярэ, хаця і ўскосна, удзел у 3-х баковых кансультацыях (Эўразьвяз, Вярхоўны Савет і Адміністрацыя прэзыдэнту) на конт пошукаў выйсьця з канстытуцыйнага крызысу.

Добра, шо Сойм прыняў усё ж правільнае рашэньне наконт выбараў -- гэта яшчэ адная стрэмка ў целе дыктатарскага рэжыму, як і частка Вярхонага Савету, якая захавала сваю адданасьць Канстытуцыі 1994 году і тым самым захавала сваю легітымнасьць. Гэта ёсьць маленькі шанец на негвалтоўнае выйсце з канстытуцыйнага тупіку і доўгатэрміновы фактар, які падрывае законнасьць усялякіх інтэграцыйных дамоваў. Добра, што і З. Пазьняк лічыць неабходнай палітыку падтрымкі Прэзыдыюма Вярхоўнага Савету.

А яна, гэтая палітыка не заўжды зьяўляецца простай, улічваючы разнагалосьсі сярод саміх дэпутатаў і супрацьдзеяньні рэжыму. Такім складаным пытаньнем і зьяўляецца эўрапейская ініцыятыва на правядзеньне кансультацыяў паміж дэлегацыямі Вярхоўнага Савету і выканаўчай улады на конт шляхоў выйсьця з канстытуцыйнага крызысу і нашае стаўленьне да яе. Гэтая ініцыятыва вымушае дэпутацкі бок ісьці на перамовы, паколькі жыцьцядзейнасьць Вярхоўнага Савету падтрымліваецца як "вулічнаю дэмакратыяй", гэтак жа і прызнаньнем з боку Эўрапейскае Супольнасьці.

Аднак ісьці на перамовы па ўдасканаляньню Канстытуцыі - небясьпечна. Бо прэзыдэнцкі бок, не адчуваючы моцнага ўціску звонку і зь сярэдзіны, будзе ў стане сарваць дамоўленасьці ў любы час. Хаця ён непасрэдна зацікаўлены ў працяглых дыскусіях, каб паслабіць, а можа і наагул пазбавіцца міжнароднае ізаляванасьці. Таму пазыцыя дэпутатаў Вярхоўнага Савету мусіць быць цьвёрдаю і прынцыповаю ды грунтавацца на некалькіх катэгарычных патрабаваньнях - спыненьне рэпрэсіяў, доступ апазыцыі да дзяржаўных СМІ і, галоўнае, аднаўленьне Канстытуцыі 1994 году і Вярхоўнага Савету XIII скліканьня дзеля ўнясеньня паправак законным шляхам.

У сувязі з гэтым хачу выказаць вялікую падзяку тым сябрам БНФ, якія мужна прайшлі праз гады рэпрэсіўных акцыяў з боку рэжыму, выстаялі і не скарыліся. Толькі вашыя цьвёрдасьць і вера ў нашую Бацькаўшчыну і нашую перамогу , ёсьць сапраўдная аснова сілы Беларускага Народнага Фронту.

**Жыве БЕЛАРУСЬ!** ■



vytoki.net

(заканчэньне, пачатак на 1-й і 2-й старонках)

Сойм гэтую маю заяву, аднак, непадтрымаў.

Дэзарганізацыя працы ў Фронце стала набіраць абароты. Кіраўніцтва з прыходам туды сп. Папкова і пры пэўнай асаблівай пазыцыі тагачаснага адказнага сакратара Управы сп. Сіўчыка (які ўглядзеў, напэўна, у маіх захадах падкопы пад свае паўнамоцтвы) *фактычна ні па адным пытаньні не магло дасягнуць таго самага кансэнсусу*, зь якім амаль не бывала праблемаў да пятага зьезду Фронту! Я адчуваў сваю агромністую віну ў гэтым, шчыра спрабаваў дапамагчы сп. Папкову (бо на яго паў выбар Старшыні) фактычна пачаць выконваць функцыі старшыні ў Беларусі, дзеля чаго пісаў заявы пра доўгатэрміновыя адпачынкі.

Але арганізатарам, кансалідоўнай фігурай сп. Папкоў рабіцца не хацеў ці ня мог. Практычна па ўсіх пытаньнях ён меў думку, адрозную ад большыні іншых намесьнікаў, і настойліва пераконваў сп. Пазьняка ў тым, што гэтая думка адзіна слушная. Рознагалосьсі датычылі найперш пытаньня аб яднаньні ўсіх грамадзкіх сілаў і ўплывовых асобаў у абароне Беларусі ад паўзучай акупацыі. Але сп. Папкоў заўсёды быў супраць. Ён быў супраць удзелу прадстаўнікоў Фронту ў Нацыянальным выканаўчым камітэце (што фактычна прывяло да праблемаў у працы нашага Грамадзкага кабінэту), супраць нашага ўдзелу ў Кангрэсе дэмакратычных сілаў, у апошняй прэзыдэнцкай кампаніі ды, урэшце, нават супраць выданьня падручніка па фронтаўскай прапагандысцкай барацьбе і супраць таго, каб Фронт займаўся арганізацыяй паездак нашых славутых пісьменьнікаў па абласцях і гарадах Беларусі!

На жаль, Старшыня Фронту амаль заўсёды станавіўся на пазыцыю сп. Папкова. У прыватнасьці, ён дакараў мяне, што я ўдараюся ў непатрэбнае культурніцтва, што веданьне прапагандысцкіх прыёмаў працы шараговымі фронтаўцамі можа быць для іх небясьпечным, што ніякага пляну працы Фронту Соймам зацьвярджаць ня трэба, а займацца выключна акцыямі "Адстаўка" і "Грамадзянства БНР". Справа дайшла да таго, што я паставіў перад лютаўскім Соймам 1999 г. пытаньне пра давер асабіста да мяне, і за гэта атрымаў ад спадароў Пазьняка і Папкова ў поўным сэнсе разнос. У выніку *ніводнае рашэньне, за якое выступала бальшыня кіраўніцтва Фронту, у апошнія два гады фактычна не выконвалася*, а рашэньні меншыні выконваліся слаба -- проста таму, што гэта **рашэньні меншыні**.

У гэтым я вінаваціць нікога не хачу, акрамя самога сябе. Я пастаянна праяўляў слабахарактарнасьць і саступаў таму, чаго патрабавалі ад мяне сп. Пазьняк і сп. Папкоў. Страты ад гэтага нёс увесь Фронт, бо лепш было, на мой погляд, хоць і не заўсёды слушна, але *нешта рабіць, чым не рабіць нічога*. Я спрабаваў і вусна і пісьмова пераконваць сп.Пазьняка ў перавазе калектыўнай думкі большыні кіраўніцтва, спрабаваў натхніць яго на разумную рэарганізацыю сыстэмы кіраўніцтва Фронтам, але гэтага не дамогся. Каюся, часьцей за ўсё мая пазыцыя была падобная да страўса з галавой у пяску: я Пазьняку прапанаваў, ну, а раз ён не падтрымаў, дык сам няхай за вынікі й адказвае. Таму за пэрыяд пасьля пятага зьезду ўсё становчае, што зроблена, трэба найперш прыпісаць не кіраўніцтву Фронту, а яго мужным і адданым беларускай справе шарагоўцам. Нізкі ім за гэта паклон!

Сёньня я, як ніколі, цьвёрда пераканаены, што арганізацыя кіраваньня такой вялікай і інтэлектуальна адметнай арганізацыяй патрабуе ўсебаковага аналізу й падтрымкі шырокімі фронтаўскімі масамі. Палітычнае лідэрства й арганізацыя штодзённай працы не павінны ўваходзіць у антаганізм адно з адным. А ўжо пра тое, як працаваць, мы можам дамовіцца й разумна арганізоўваць і каардынаваць нашыя дзеяньні. ■

*Алесь БЯЛЯЦКІ*

(заканчэньне, пачатак на 3-й і 4-й старонках)

**шэйшымі кіраўнічымі органамі ёсьць Зьезд і Сойм, усе рашэньні прымаюцца на падставе калегіяльнага абмеркаваньня, а не загадам адной асобы.**

5. Як, вы лічыце, трэба ладзіць адносіны з журналістамі:

а (*2*). лаяцца зь імі, абзываць прадажнымі, запісваць у агенты КГБ

ці

**б (*30*). пры любых умовах і абставінах паказваць паважлівыя адносіны да журналістаў і іхнай цяжкай працы, дэманструючы свае маральныя перавагі і моц.**

6. Як вы лічыце, для перамогі ў барацьбе за абарону незалежнасьці Беларусі:

а (*5*). старшыня БНФ "Адраджэньне" павінен кіраваць фронтам з-за мяжы

ці

**б (*26*). змагацца разам з сябрамі, ахвяруючы, як і шараговыя фронтаўцы, дзеля Бацькаўшчыны.**

7. Як вы лічыце, незалежнасьць Беларусі можна абараніць:

**а (*26*). на падставе дакладнага навуковага аналізу**

ці

б (*3*). на падставе інтуіцыі аднаго лідэра?

*Увага: у адной анкеце падкрэсьленыя абодва адказы.*

***Зразумела, анкетаваньне на сэмінары нельга лічыць рэпрэзэнтацыйнаю сацыялягічнаю выбаркаю. Але ж на трэнінг прыехалі найбольш актыўныя й аўтарытэтныя людзі. І, згадзіцеся, уражвае абсалютная перавага адказаў пэўнага тыпу. Гэтыя адказы -- галасаваньне супраць сэктанцтва, гэта бачаньне БНФ як рэалістычнага, адкрытага, сучаснага незалежніцкага руху. І вельмі цешыць, што людзі выказваліся не з чужога голасу, а слухаючы найперш сябе.*** ■

## ФІРМА "А.КРЫВАРОТ, І.КРЫВАРОТ @ К".

Мною ў рэдакцыю перададзены зварот аднаго сябра фронту, у якім ён просіць дапамагі.

Сутнасьць справы ў тым, што яшчэ тры гады таму ён аддаў значную суму ў далярах брату спадара А. Крыварота – І. Крывароту, пра што ў яго папрасіў А. Крыварот, паабяцаўшы рэгулярна выплочваць працэнты з гэтай сумы. А мы ж ведаем, што ў фронтаўцаў паміж сабой асаблівы давер, асаблівa калі гарантам выступае даволі вядомая ў фронце асоба. Таму і ў голаў гэтаму нашаму фронтаўцу не прыйшло не паверыць. Як ён піша, ён падумаў, што чым гэтыя грошы будуць ляжаць, няхай зь іх

(працяг на 10-й старонцы)



vytoki.net



*Вячаслаў*
***СІЎЧЫК***
*сакратар*
*Управы БНФ*

# ЯКІ МУСІЦЬ БЫЦЬ НАРОДНЫ ФРОНТ

*(працяг - пачатак у 2-м нумары)*

**Праца ў трэцім сэктары**: падтрымка актыўных людзей з грамадзкімі ініцыятывамі, супрацоўніцтва з рэгіянальнымі аддзяленьнямі вядомых рэспубліканскіх няўрадавых арганізацыяў і рэгістрацыя мясцовых. Асаблівая ўвага надаецца супрацоўніцтву з ТБМ, "Вясной-96", "Супольнасьцю", Фондам імя Л.Сапегі й незалежнымі прафсаюзамі. Рэанімуюцца рэспубліканскія грамадзкія арганізацыі экалягічнага кірунку (не забывайма, якую ролю адыграў БЭС на працягу 1989-1991 гадоў). Стваранцца аргкамітэты арганізацыяў для абароны эканамічных інтарэсаў грамадзянаў (існуюць як мінімум дзьве масавыя катэгорыі грамадзян, якія ўжо маюць свае інтарэсы:

1) пасьля прыватызацыі кватэраў - домаўладальнікі;

2) фэрмеры й дачнікі - землеўладальнікі).

Ствараюцца грамадзкія юрыдычныя прымальні для праўнае дапамогі насельніцтву.

**Стварэньне фінансавай базы.** Наладжваньне сувязяў са спонсарамі, падрыхтоўка праектаў і падача заявак на гранты на ўсіх узроўнях – як на нацыянальным (кіраўніцтва БНФ), так і на мясцовым (рэгіянальныя й раённыя рады)

**Распрацоўка праграмаў.**

1. Грамадзкі (ценевы) кабінэт мусіць падрыхтаваць комплексную праграму разьвіцьця краіны, усіх асноўных галінаў народнае гаспадаркі; праграму станаўленьня рэгіёнаў; ствараe банк дадзеных і прыцягвае неабходных спэцыялістаў.

2. Натуральна, ня маем права забывавацца пра вулічныя мерапрыемствы, культурніцкую дзейнасьць, распаўсюд нацыянальнай сымболікі й беларускіх кніг ды інш.

3. Беларускі Народны Фронт мусіць перакласьці на сучасную мову нацыянальную ідэю. Дзеля гэтага патрабуецца актывізацыя кожнага фронтаўца, а ніякія не разборкі ды расколы. Таму кіраўніком Фронту сёньня мусіць стаць лідэр, за плячыма якога будзе каманда, якая здолее ці не штодзённа ахвярна ды прафэсійна працаваць. Натуральна, у варунках, якія склаліся сёньня, старшыня мусіць быць на Беларусі. Бо інакш будзе горш. ■

# ВЫСТУП, ЯКІ НЕ ПРАГУЧАЎ НА СОЙМЕ

*Мікалай КАРОТКІ*
*Сьмілавічы*

Вельмі цяжка ўсьведамляць тое, што адбываецца. Я не адхіляю заслугаў Пазьняка, ягонае руплівасьці і г.д., але ж трэба глядзець на рэчы цьвяроза. Пазьняк усё далей адрываецца ад жыцьця, ад народу, за які змагаецца. Ён надта падазрона глядзіць на людзей. Асабліва калі зьяўляюцца якія-небудзь магчымыя яму канкурэнты, ён кляйміць усіх стаўленьнікамі Масквы. Ён што, зьбіраецца адзін і голымі рукамі перамагчы? Наш Фронт усё больш становіцца сэктаю, адарванаю ад праблемаў грамадзкае супольнасьці. Я з глыбінкі, і таму бачу і чую, што думае большасьць людзей. Праедзьце па вёсках, мястэчках, гарадох - і вы ўбачыце: ці можа атрымаць галасы Пазьняк? - Не! Патрэбна аб'ядноўвацца ўсім дэмакратычным сілам, інакш перамогі не відаць.

Людзі выходзяць з Фронту. Калі так будзе і надалей, то З. Пазьняк застанецца адзін. Для каго ж ён змагаецца? Чаму адрываецца ад людзей? Чаму бачыць ва ўсіх толькі ворагаў? Ужо і Вярхоўны Савет 13-га скліканьня мы павінны абвясьціць ворагам?!

Вось так і будзем ваяваць з усімі да скону! А для каго і навошта? Колькі мы ўжо стварылі пустога і патрацілі дарма сілаў! А цяпер зноў пустое рабіць - ужо грамадзянскі парлямэнт, у той час калі ёсьць законна абраны.

Не, сябры, калі ісьці цяперашнім шляхам Пазьняка, то застанецеся вы адны, што праўда, з Пазьняком!

Ведайце, выйдуць з Фронту разумныя і з досьведам людзі, не падтрымаюць Пазьняка цэлыя арганізацыі на месцах!

Хопіць быць сэктаю! Не разьбівайце Фронт! ■

*(заканчэньне, пачатак на 9-й старонцы)*

тэрмін, а можа быць і назаўсёды. Круцяцца гэтыя грошы, узбагачаючы двух прадпрыймальных братоў.

Неверагодная на першы погляд гісторыя. Здавалася б, не такія ўжо фронтаўцы і багатыя людзі, але нават і сярод іх можна стварыць сваё "МММ" – ККК. Самае прыкрае тое, што некаторыя людзі паверыўшы, аддавалі літаральна ўсё, што здолелі ашчадзіць, а зараз і ня ведаюць – ці вернуцца да іх гэтыя грошы ўвогуле.

А можа быць гэта адзін са сродкаў сп. А. Крываротy трымаць актывістаў фронту пад сваім уплывам? Парадаксальна, але пагадзіцеся, хто ж будзе крытыкаваць ці выступаць супраць чалавека, які табе павінен і не аддае пазыку? Бо кожны з тых, хто патрапіў у гэтую пастку, зараз думае, толькі пра тое,як бы вярнуць свае грошы.

З.Пазьняк пахваліў сп. А. Крыварота ў адным са сваіх апошніх факсаў за тое, што той дакладна выконвае загады. З гэтага вынікае, што ён даверае сп. А. Крывароту. І за асабістую адданасьць зноў будзе прапаноўваць яго на кіраўнічую пасаду ў фронце. Хай бы можа ён загадаў яму напачатку вярнуць выманеныя грошы фронтаўцам. ■

**Рэдакцыя бюлетэню зьвяртаецца да ўсіх хто хоць неяк пацярпеў ад вышэй згаданых амаральных дзеяньняў сп. А. Крыварота і ягоных падручных з просьбаю даслаць інфармацыю да нас у рэдакцыю!"**
**Мы не павінны дапусьціць каб такія людзі, кіравалі дэмакратычнаю арганізацыяй, якая прапагандуе прынцыпы хрысьціянскіх каштоўнасьцяў грамадзтву.**
*Сярод хрысьціянаў адною з галоўных запаведзяў ёсьць не абмані – не ўкрадзі!* ■



vytoki.net

# ЗВАРОТ СЯБРАЎ БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ" г. БЕРАСЬЦЯ ДА ДЭЛЕГАТАЎ VI ЗЬЕЗДУ БНФ

*6 ліпеня 1999 году*

Апошнім часам Беларускі народны фронт "Адраджэньне" перажывае сур'ёзны крызіс. У кіраўніцтве БНФ фактычна адбыўся падзел. Па-рознаму ставяцца сябры БНФ і да дзеяньняў Старшыні фронту Зянона Пазьняка. Прычыны крызісу, на наш пагляд, далёка не ў амбіцыях асобных лідараў БНФ, а ў адыходзе часткі кіраўнікоў БНФ ад прынцыпаў дэмакратычнасьці і калегіяльнасьці пры выпрацоўцы і прыняцьці рашэньняў.

Падобныя ненармальныя зьявы знайшлі свой адгалосак і ў Берасьцейскай арганізацыі БНФ. Шэраг сябраў БНФ нават вымушаны былі адыйсьці ад актыўнай дзейнасьці ў арганізацыі.

Для многіх з нас непрымальны той бюракратычны і недэмакратычны стыль кіраўніцтва, які практыкуе Берасьцейская абласная і гарадзкая Рады БНФ. Нормай стала прыняцьцё рашэньняў у вузкім коле, без шырокага сяброўскага абмеркаваньня. Яскравым прыкладам гэтага сталі апошнія выбары Рады Берасьцейскай гарадзкой арганізацыі, выбары дэлегатаў на абласную справаздачна-выбарчую канфэрэнцыю БНФ, так званае "зацьвярджэньне" выбарным органам - гарадзкой Радай - дэлегатаў на Зьезд БНФ. Улічваючы, што Зьезд будзе абмяркоўваць складаныя пытаньні дзейнасьці БНФ, абярэ новае кіраўніцтва, такі адбор дэлегатаў лічым проста ганебным, бо як у камуністычныя часы, ён ігнаруе думкі часткі сябраў БНФ. Частка сябраў БНФ нават няведала пра ўсе гэтыя выбары, бо ім не палічылі неабходным паведаміць пра гэта, тым больш, што ніякіх абвестак у памяшканьні БНФ не вывешвалася. Робіцца ўсё, каб правесьці толькі адзін "правільны" погляд, каб не дапусьціць да абмеркаваньня складаных праблемаў дзейнасьці БНФ магчымых апанэнтаў.

Мы лічым несумленнымі і вельмі шкоднымі для дэмакратычнага адраджэнскага руху ў Беларусі падобныя дзеяньні, што зрабіліся практыкай. Такі характар дзейнасьці, пэўна, інсьпіруецца некаторымі мясцовымі кіраўнікамі, а таксама сябрам Управы БНФ Анатолем Крываротам, намесьнікам старшыні БНФ Сяргеем Папковым.

Заклікаем дэлегатаў Зьезду стаць на абарону прынцыпаў калегіяльнасьці і дэмакратыі ў нашай арганізацыі, не дапусьціць пераўтварэньня яе ў закрытую, зафармалізаваную і аўтарытарную структуру. Спадзяемся, што дэлегаты Зьезду адказна паставяцца да выбару новага кіраўніцтва БНФ, даверыўшы яго тым, хто будзе няўхільна трымацца згаданых прынцыпаў. Просім таксама даць слова гасьцям Зьезду, якія не былі абраныя дэлегатамі з-за маніпуляцыяў асобных функцыянэраў.

Мы павінны выйсьці з гэтага крызісу годна, паказаўшы прыклад усяму беларускаму грамадству, як трэба вырашаць праблемы.

**Жыве Беларусь!** ▪

---

**ПАРАЛЕЛІ**

**27.07.99 19:52**

***Іван ЛАЗАВЫ***

## "АДСУТНАСЬЦЬ ЛІДЭРА НА БЕЛАРУСІ СТВАРАЕ ПЭЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ"

**З намесьнікам старшыні Народнага Руху Украіны Іванам ЛАЗАВЫМ размаўляе палітычны аглядальнік *Паўлюк БЫКОЎСКІ***

**П. Б.** -- Што зьмянілася ў Руху пасьля той трагедыі, што здарылася з Чорнавілам?

***І. Л.*** -- Безумоўна, Рух страціў найвялікшага свайго аўтарытэта, чалавека, які стаяў на галаву вышэй чым які іншы лідэр нацыянальна-дэмакратычных сілаў Украіны. Такая вялікая утрата для Руху. Я пабачыў як людзі зразумелі постфактум, што было згублена. Да гэтага была сур'ёзная недацэнка. Калі Вячаслаў Максімавіч Чорнавіл пайшоў з жыцьця, на яго пахаваньне раптоўна прыйшлі 20 тысячаў чалавек, тыды, калі два месяцы раней, на гадавіну незалежнасьці Украіны на яго заклік, заклік Руху прыйсьці на Сафійскі майдан, -- прышлі дзесьці 500 чалавек. Але гэтае ёсьць трагедыяй Украіны -- мы не вытрывалі той выклік, што нам быў наканаваны, і сытуацыя, безумоўна, пагоршала.

**П. Б.** -- Якое месца зараз Рух, на вашую думку, займае сярод іншых палітычных сілаў Украіны?

***І. Л.*** -- Гэта, як і было, застаецца адзіная некамуністычна партыя, якая, па-першае, ёсьць партыяй, бо астанія так званыя партыі, большыя ці меншыя, - гэта без выключэньняў структуры аднаго чалавеку. Яго няма - і партыі няма. Той жа Паўло Лазарэнка - яго асабісты праблемы і "Грамады" ня стала, фракцыя ў парлямэнце адразу распалася аж на 3 часьціны, партыя перастала існаваць. Гэта ёсьць лягічным наступствам таго, як утвараліся гэтыя партыі. Тым часам Рух існуе больш за 10 год, мае даўгія даўнія карані, мае структуры ва ўсіх абласьцёх. Доказам сваёй шырыні і глыбені Рух мае тое, што на мінулых выбарах Рух перайшоў чатырохадсодкавы бар'ер у 23 з 25 абласьцей. Выключэньнем сталіся шахцёрскія вобласьці -- Данецкая і Луганская, дзе Рух атрымаў маньш за 4%. Найцяжэйшым рэгіёнам быў Крым, але там нам найбольш дапамаглі крымскія татары і Рух атрымаў больш за 6%. Але гэта ёсьць доказам таго, што Рух ёсьць сур'ёзнай агульнаўкраінскай партыяй, якая, дазволю сабе сказаць, ніколі не залежыла і цяпер не залежыць ад аднаго аўтарытэта ці лідэра, нават Чорнавіла.

**П. Б.** -- Якая зараз галоўная праблема стаіць перад Рухам?

***І. Л.*** -- Існуе адна праблема - арганізацыйная. Як знайсьці стымулы, зрабіць працэдуры, мэханізмы і кантроль, якія будуць ініцыіраваць і спрыяць, дапамагаць нарошчваньню сілаў. Калі гэтае атрымаецца, то праз тры гады на выбарах у нас будуць вялікія пэрспектывы. Калі гэтыя рэчы ня будуць зроблены, то Рух застанецца на тым узроўні, што мае зараз. Ён будзе другой партыяй пасьля Камуністычнай.

*(далей будзе)*



vytoki.net

*(заканчэньне, пачатак у №2 бюлетэню і на 7-й старонцы гэта нумару)*
дастаткова аўтарытэтны, каб стаць дамінуючай сілай у беларускіх НДА; фронтаўцы ўжо зараз дэ-факта складаюць ільвіную долю сярод кіраўнікоў недзяржаўных арганізацыяў па ўсёй краіне.

Беларускі Народны Фронт вядзе Беларусь у Эўропу, і таму ён павінны скарыстаць магутную падтрымку эўрапейскіх кансэрватараў і хрысьціянскіх дэмакратаў, якія ўсё набіраюць вагі й становяцца найбуйнейшай ды найбольш уплывовай сілай ЭўраЗьвязу. Цеснае міжнароднае супрацоўніцтва БНФ з Народнай Партыяй Эўропы, а таксама нацыянальнымі цэнтрысцкімі і правацэнтрысцкімі рухамі ня толькі ўмацуе пазыцыі БНФ у Беларусі, але й паставіць на Захадзе заслону пашыраным прарасейскім сындромам "трубы" і "калідору".

Фронт, назва якога гучыць па-ангельску як Belarusian Popular Front, мусіць імкнуцца быць папулярным. Не папулісцкім, а менавіта папулярным. Уяўленьне пра БНФ як арганізацыю антыкамуністычную й антыімпэрскую павінна дапоўніцца абрысамі стваральнага эўрапейскага, хрысьціянскага ў сваёй аснове вобразу, які мае на ўвазе абарону спрадвечных каштоўнасьцяў і выключае абвінавачваньні ў дэструктыўнасьці й экстрэмізме. Няспынная дзейнасьць такога кшталту дазволіць узнавіць высокі аўтарытэт БНФ сярод усіх слаёў насельніцтва, набраць крытычную масу для мірных шматтысячных вулічных выступленьняў і, што яшчэ важней, стварыць трывалы падмурак даверу для пабудовы Нашага Беларускага Дому.

Каляндарны кругабег вулічных акцыяў, што прабуксоўвае апошнія два гады, мусіць улічваць актуальныя масавыя настроі ў дадзены момант і апэратыўна адгукацца на надзённыя падзеі, пра якія гавораць і краіна, і сьвет.

Калі зноў злачынна замоўчваюцца наступствы Чарнобыля, калі зноў беларускай прыродзе пагражаюць індустрыяльныя монстры, а ў запаведніках прэзыдэнцкія "управделы" рубяць лес на вываз, Народны Фронт, як у канцы 80-х, павінны весьці экалягічны рэй.

Сёньня, калі рэжым бессаромна спойвае народ, а моладзь ахопленая эпідэміяй наркаманіі й СНІДу, калі мясцовая злачыннасьць сьпелася з расейскай мафіяй, менавіта БНФ застаецца усенародным фронтам змаганьня з крыміналізацыяй, татальным алькагалізмам і разбэшчваньнем грамадзтва. Трэба праводзіць інфармацыйныя кампаніі і ствараць грамадзкія камітэты, весьці растлумачальную работу. Беларуская мова на варце сямейных, маральных каштоўнасьцяў - лепшая агітацыя за ідэі Адраджэньня.

Яшчэ адзін моцны крок - прапаганда здаровага ладу жыцьця й духоўнага разьвіцьця, арганізацыя й падтрымка спартовых спаборніцтваў, падлеткавых гурткоў і маладзёвых таварыстваў.

Адукацыя й культура - найважнейшыя сфэры дзейнасьці Фронту, якая павінна сёньня прыняць характар масавае асьветы з распрацоўкай і абнародваньнем агульнабеларускіх праграмаў, зьбіраньнем навукова-практычных канфэрэнцыяў, заснаваньнем альтэрнатыўных афіцыёзу, сапраўды папулярных нацыянальных адукацыйна-культурніцкіх установаў, выданьняў і мерапрыемстваў.

Пэрспэктывай нацыянальна сьведамага грамадзтва, будучыняй сапраўднае Беларусі ёсьць моладзь, перадусім гарадзкая. Стаўка на праэўрапейскае, актыўнае й дынамічнае пакаленьне'2000 мусіць стаць прынцыпам далейшае працы Фронту.

Беларускі Народны Фронт павінны праявіць сваю салідарнасьць з усімі нацыянальнымі супольнасьцямі Рэспублікі Беларусь у іх правах. Надыйшоў час усьведаміць і становішча расейскае дыяспары як нацыянальнае меншыні.

Урэшце, фундамэнтальным абавязкам БНФ ёсьць падтрымка царквы, касьцёлу й актыўнае ўзаемадзеяньне з усімі хрысьціянскімі канфэсіямі ў краіне. Духоўнае Адраджэньне беларускае нацыі немагчымае бяз Бога.

Сёньня дастаткова ўзяцца за справу, паказаць, што мы хочам, гатовыя, што мы сапраўды здольныя ўзяць на сябе адказнасьць за Беларусь - і ў нас паверацьь.

*Другое дыханьне даецца мацнейшым.*
*Мы разумеем, што з антыбеларускім рэжымам,*
*з пагрозамі дзяржаўнасьці краіны*
*й глыбінным пераўтварэньнем грамадзтва*
*можа справіцца толькі адзіны,*
*унутрана моцны й сапраўды папулярны*
**БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ФРОНТ**.

Менск, 31.VII.99

**Навіны**
РАДАЎ
**БНФ "Адраджэньне"**
Інфармацыйны бюлетэнь
Наклад 299 асобнікаў

**Бюлетэнь заснавалі:**
Гарадзенская гарадзкая Рада,
Магілёўская абласная Рада, пратаколам №4 ад 12 чэрвеня
Кастрычніцкая раённая Рада БНФ, г. Менск пратаколам №2 ад 16 чэрвеня

**Рэдактар, дызайн і вёрстка:**
Вітай Жагунь-Шаркоўскі
**Адказныя за выпуск:**
Вінцук Вячорка
Віктар Івашкевіч

**Рэдакцыя не нясе адказнасьці за недакладнасьці ў аўтарскіх матэрыялах. Пры перадруку абавязковая спасылка на выданьне.**

**Адрас для ліставаньня:**
***Менск, 220 006, а/с 27***



vytoki.net